садочного материала в постоянном лесном питомнике Логойского лесхоза», «Почвы еловых насаждений Вилейского лесхоза и проект рационального использования их плодородия», «Проект лесокультурных мероприятий в Толочинском лесхозе», «Проект облесения песчаных земель в Глусском лесхозе», «Проект механизации лесокультурных работ в Гродненском лесхозе с определением состава машинотракторного парка» и т. п.

Для определения почвенного плодородия и продуктивности лесных насаждений в полевых условиях студенты закладывают почвенные разрезы, изучают морфологию почв, берут образцы почв для анализов. В лабораторных условиях проводят определение механического состава почв и основных химических показателей. По результатам исследований делают заключение по подбору древесных пород для создания лесных культур с целью рационального использования почвенного плодородия.

Важным моментом в подготовке дипломного проекта (работы) к защите является предварительная его защита на кафедре. Вопросы, задаваемые на предварительной защите, психологически подготавливают студента к защите в ГЭК. Кроме того, здесь выявляются недоработки, которые своевременно устраняются.

При правильном выборе темы, хорошо согласующейся с основной работой студента-заочника, ответственном выполнении дипломного проектирования успешно проходит защита в ГЭК, а результаты проведенных исследований находят непосредственный выход в производство.

УДК 808.26:371.31

В.А. Кузьміч, загадчык кафедры

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС ЯК ДЫДАКТЫКА-МЕТАДЫЧНЫ СРОДАК ЗАБЕСПЯЧЭННЯ НАВУЧАЛЬНАГА ПРАЦЭСУ

The issue presents new understanding of the role of scientific-methodical complex in educational process. Singular stress is made on the developing of communicative skills and cultural competence of students.

На сённяшні дзень у свеце шырока праводзяцца рэформы нацыянальных адукацыйных сістэм, якія разглядаюцца адукацыйнай супольнасцю як надзейнае забеспячэнне развіцця народаў і нацый. Захаванне і памнажэнне інтэлектуальнага патэнцыялу нашай краіны ў ходзе падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў непасрэдна звязана з якасцю універсітэцкай адукацыі. Асноўным яе крытэрыем пры гэтым уяўляецца не столькі адпаведнасць узору (адукацыйнаму стандарту), колькі здольнасць рыхтаваць маладое пакаленне да бесперапыннага назапашвання ведаў і фундаментальных агульначалавечых каштоўнасцей, да авалодання прыемамі і спосабамі ажыццяўлення сацыяльнай і прафесійнай камунікацыі ў далейшым.

Працэс змянення адукацыйных прыярытэтаў і каштоўнасных арыентацый патрабуе змяненняў у сістэме дыдактыка-метадычнага забеспячэння працэсу выкладання. Немалаважную ролю ў пераарыентацыі універсітэцкага навучання адыгрываюць вучэбна-метадычныя комплексы па дысцыплінах. Вучэбна-метадычны комплекс з'яўляецца неабходным кампанентам удасканалення вышэйшай адукацыі.

Якім павінен быць вучэбна-метадычны комплекс і як яго распрацоўваць, каб ён адпавядаў патрэбам рэфармавання адукацыі і тэндэнцыям яе развіцця ў сучасных умовах? Дадзенае пытанне неаднаразова разглядалася ў айчыннай дыдактыцы. Вучэбна-

метадычныя комплексы пачалі распрацоўвацца яшчэ з 1982 г., але часцей за ўсё ўяўлялі сабой пэўны набор дакументаў, не звязаных паміж сабой канцэптуальнай ідэяй і цэласным псіхолага-педагагічным абгрунтаваннем. Сучасны ўзровень развіцця адукацыі патрабуе стварэння новага пакалення вучэбна-метадычных комплексаў, якія ўлічвалі б шматузроўневы і шматкампанентны характар вучэбна-выхаваўчага працэсу. На думку вучоных, якія займаюцца распрацоўкай вучэбна-метадычных комплексаў новага пакалення (Д.Д. Зуеў, В. П. Бяспалька, Ю.Г. Татур, А.В. Макараў, З.П. Трафімава, В.С. Вязоўкін, Ю.Ю. Гафарава), у структуры адзначанай дыдактыка-метадычнай адзінкі павінна быць матэрыяльна ўвасоблена ўзаемасувязь мэтаў, зместу, дыдактычных працэсаў і арганізацыйных формаў навучання. Адзначаныя элементы самі па сабе не могуць быць кампанентамі вучэбна-метадычнага комплексу, але, знаходзячыся ў структурна-функцыянальным узаемадзеянні, пэўным чынам вызначаюць навучальны працэс.

На сённяшні дзень існуе мноства рознафункцыянальных мадыфікацый вучэбна-метадычных комплексаў. Але, з'яўляючыся своеасаблівым узорам і ў той жа час інструментам дыдактыка-метадычнага забеспячэння навучальнага працэсу, вучэбна-метадычны комплекс павінен не толькі фіксаваць, але і канкрэтызаваць патрабаванні да зместу дысцыпліны, уменняў і навыкаў, аб'ядноўваць сродкі навучання, усебакова стымуляваць вучэбна-выхаваўчы працэс. Узятыя паасобку кампаненты вучэбна-метадычнага комлексу (праграма, падручнік, вучэбна-метадычны дапаможнік, практыкум і г. д.) не валодаюць навучальным патэнцыялам, калі яны не звязаны адзіным канцэптуальным падыходам. Як жа дасягнуць аптымальнай функцыянальнай накіраванасці вучэбна-метадычнага комплексу ва ўмовах усеагульнай распрацоўкі яго асноў? Над гэтым пытаннем працуюць шматлікія калектывы ВНУ нашай краіны. Не з'яўляецца выключэннем і кафедра беларускай мовы БДТУ.

Пошукі ў вышэйзгаданым напрамку сканцэнтраваны перш за ўсё на вызначэнні скразной ідэі навучання роднай мове ў ВНУ. Калектыў кафедры разглядае універсітэцкую адукацыю як магчымасць для выяўлення навуковых ведаў пры дапамозе актыўнай камунікацыі. Працэс навучання суадносіцца не толькі з абмежаваным колам дзеянняў, але таксама з непарыўным самаўдасканаленнем асобы шляхам вырашэння нестандартных задач, з самастойным навуковым і творчым пошукам. Павышэнне якасці моўнай адукацыі калектыў кафедры звязвае з бесперапынным развіццём маўлення студэнтаў, уключэннем навучэнцаў у індывідуальную стваральную дзейнасць. У такіх умовах асаблівую важнасць набывае распрацоўка вучэбна-метадычных комплексаў па беларускай мове, практычнай і функцыянальнай стылістыцы беларускай мовы як дысцыплінах, што забяспечваюць працэс навучання ў цэлым. Надзвычайную актуальнасць набывае каардынацыя намаганняў вучоных-метадыстаў і выкладчыкаў кафедры ў напрамку забеспячэння арганічнай узаемасувязі паміж утваральнымі кампанентамі комплексу, дысцыплінамі на міжпрадметным узроўні (узгадненне праграм). Вучэбна-метадычныя комплексы па беларускай мове і практычнай і функцыянальнай стылістыцы беларускай мовы, якія актыўна распрацоўваюцца супрацоўнікамі кафедры, маюць на мэце не толькі стварэнне пэўнай дыдактыка-метадычнай мадэлі, але і забеспячэнне яе адпаведнымі сродкамі і кіраўніцтвам да самаадукацыі. Развіццё маўлення праходзіць скразной лініяй праз метадычныя распрацоўкі для студэнтаў вочнай і завочнай формы навучання. Прадугледжваецца разгорнутая схема кантролю і самакантролю студэнтаў, што надзвычай актуальна ў рэчышчы павелічэння долі самастойнай працы навучэнцаў. Безумоўна, вядучая роля належыць арганізацыі актыўнай або апасродкаванай камунікацыі. Навучанне мове як сродку, здольнаму стымуляваць нараджэнне новых

формаў культурнага і грамадскага жыцця, садзейнічаць самастойнасці ў паводзінах і учынках асобы, фарміраваць творчую індывідуальнасць будучага спецыяліста, прадугледжвае вырашэнне пры дапамозе вучэбна-метадычнага комплексу наступных галоўных **задач**:

– паказаць ролю мовы і маўлення ў працэсе сацыялізацыі і культурнай ідэнтыфікацыі асобы;

– вызначыць ролю і прызначэнне мовы ў жыцці чалавека;

– даць студэнтам трывалыя веды па лінгвістычнай тэорыі і выпрацаваць на іх аснове аналітычныя і канструктыўныя ўменні, звязаныя з распазнаваннем, класіфікацыяй і навуковай інтэрпрэтацыяй разнастайных моўных адзінак;

– развіваць здольнасці студэнтаў, неабходныя для ўспрыняцця, разумення, трансфармацыі, стварэння тэкстаў багатага духоўнага зместу, разнастайных па жанравай і стылістычнай накіраванасці;

– стымуляваць актыўную дзейнасць студэнтаў як умову паспяховай ідэнтыфікацыі індывіда ў грамадстве.

Стварэнне эфектыўнага і сучаснага навукова-метадычнага комплексу з'яўляецца адной з галоўных перадумоў рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі ў галіне адукацыі. Ад якаснага дыдактыка-метадычнага забеспячэння навучальнага працэсу залежыць падрыхтоўка спецыялістаў, якія ў аднолькавай ступені будуць валодаць не толькі высокім прафесіяналізмам, але таксама агульнакультурным патэнцыялам.

## ЛІТАРАТУРА

1. Беспалько В. П. Педагогика и прогрессивные технологии обучения. – М., 1995.

2. Образовательный стандарт. Высшее образование. Цикл социально-гуманитарных дисциплин. Руководящий документ Республики Беларусь. Министерство образования Республики Беларусь. – Мн., 1999.

3. Учебно-методический комплекс: модульная технология разработки: Учебно-методическое пособие / А.В. Макаров, З.П. Трофимович, В.С. Вязовкин, Ю.Ю. Гафарова. – Мн.: РИВШ БГУ, 2001.

УДК 371.3:378

В.К. Мароз, дацэнт; А.А. Крыварот, выкладчык МІК

# ДА ПРАБЛЕМЫ ЎВЯДЗЕННЯ ІНАВАЦЫЙ У АДУКАЦЫЙНЫ ПРАЦЭС

In the article the theoretical aspects in introduction of new ideas innovation and novelty into the pedagogical science and educational sphere.

Неабходнасць фарміравання ў моладзі прынцыпова новага светапогляду з'яўляецца найважнейшай мэтай сістэмы адукацыі. Гэта будзе спрыяць адэкватнаму ўспрыняццю сутнасці і наступстваў глабальных працэсаў, якія адбываюцца ў сучасным свеце. Невыпадкова XXI стагоддзе аб'яўлена ЮНЕСКА стагоддзем адукацыі. Таму сёння ў педагогіцы ўсё больш настойліва гучаць галасы пра неабходнасць зменаў ва ўсёй адукацыйнай сістэме. Новаўвядзенні (інавацыі) у сферы адукацыі ў рэчышчы глабальных адукацыйных тэндэнцый набываюць пашырэнне ў шмат якіх краінах свету, у тым ліку і ў Рэспубліцы Беларусь.

Паняцце *інавацыя* (з лацінскай мовы абнаўленне, змены, увод чагосьці новага, увядзенне навізны) з'явілася ўпершыню ў даследаваннях культуролагаў XIX стагоддзя і